# РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕНЧАГА СЛЫХУ

Н.С.Старжинская, Д.Н.Дубинина

Развіццё слыхавога ўспрымання і маўленчага слыху апярэджвае вымаўленчыя магчымасці дзіцяці. Паміж узнікненнем здольнасці дзіцяці ўспрымаць нейкую маўленчую адзінку і здольнасцю яе самастойна прадуцыраваць можа быць часавы інтэрвал у некалькі месяцаў і нават гадоў. Дастаткова ўспомніць вясёлы расказ Драгунскага "Шышкі", у якім апісваецца, як трое дзяцей насміхаюцца адзін з аднаго з-за няправільнага вымаўлення гэтага слова. Кожны з іх выдатна чуе памылку ў вымаўленні равеснікаў, але і сам вымаўляе неправільна (*сыскі*, *хыхкі*, *фыфкі*).

◄ *Калі развіваецца маўленчы слых?*

Перадумовы для развіцця фанематычнага слыху фарміруюцца ў дзіцяці ў даславесны перыяд. Вельмі рана ў дзяцей развіваецца здольнасць адрозніваць па галасе блізкіх людзей, на слых успрымаць змяненні голасу па вышыні і сіле, адчуваць эмацыянальную афарбоўку маўлення. На пятым месяцы жыцця немаўля распазнае тон голасу, на восьмым – агульны характар інтанацыі (пытальную, ласкавую, патрабавальную). У 6 – 12 месяцаў дзеці асабліва ўспрымальныя да рытма гучальнага маўлення М.Х. Швачкін, К.І. Чукоўскі і інш.). У эксперыменце, праведзеным Н.Х. Швачкіным, дзяцям 6 месяцаў паказалі, як трэба пляскаць у далоні пад словы "стук-стук". Затым эксперыментатар замяняў "стук-стук" на іншыя спалучэнні гукаў (у-у, о-о). Дзеці працягвалі пляскаць, што сведчыць пра тое, што гукавы склад для іх не меў значэння, яны арыентаваліся выключна на рытм. Калі вымаўлялася адзіночнае слова "стук", дзеці не рэагавалі на яго.

Як відаць, у ранні перыяд маўленчага развіцця асноўную сематычную нагрузку нясуць інтанацыя, рытм, агульны гукавы малюнак слова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

◄ *Калі адбываецца развіццё фанематычны слых?*

Рашаючае значэнне для засваення гукаў роднай мовы мае развіццё сенсорнай асновы маўлення – фанематычнага слыху. Пры асваенні гукавога боку маўлення, пісаў Д.Б.Эльконін, фанематычны слых выступае *двойчы*. *Першы* раз на яго аснове задаецца ўзор вымаўлення гука, *другі* раз – вынік дзеяння. Дзіця павінна дакладна адрозніваць гук, зададзены дарослым, ад гука, які рэальна ім самім вымаўляецца. Гэта з'яўляецца асноўнай перадумовай пачатку прадуцыравання маўлення.

Здольнасць успрымаць гукавы склад маўлення ўзнікае ў канцы першага – пачатку другога года жыцця. У апісаным вышэй эксперыменце гадавалым дзецям дастаткова было пачуць адно слова "стук", і яны пляскалі ў далоні. Яны арыентаваліся менавіта на гукавую абалонку слова. Важна адзначыць, што дзіця не звяртае ўвагі на розныя варыянты вымаўлення фанем, яно вельмі хутка асвойвае істотныя прыметы гукаў сваёй роднай мовы.

Па даных М.Х. Швачкіна, дзіця ужо ў канцы першага года жыцця адрознівае галосныя і зычныя гукі, розныя групы зычных (санорныя, цвёрдыя, мяккія і інш.). На першых этапах дзіця адрознівае далёкія фанемы [д] і [к], [а] і [ж] і не дыферэнцыруе блізкія [д] і [т], [г] і [х], [з] і [с], [б] і [п]. Гэта праяўляецца ў тым, что малыя правільна  разумеюць розныя па гукавым складзе словы: «акно», «ляля», але блытаюць блізкія па гучанні: «суп», «зуб».

Фанематычны слых развіваецца дастаткова хутка. Даследаванне М.Х.Швачкіна паказала, што ўжо ў дзяцей аднаго года сямі месяцаў фанематычны слых аказваецца сфарміраваным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ